ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985

31

КАСТРЫЧНІКА

ЧАЦВЕР

№ 29 (1479)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

## БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ ТЭЛЕТАЙП

«ЎЧОРА - СЁННЯ - ЗАЎТРА»

### «50 ГАДОЎ СТАХАНАЎСКАГА РУХУ»

— пад такой назвай прайшла на гістарычным факультэце тэматычная канферэнцыя, прысвечаная працоўнаму подзвігу Аляксея Стаханава.

Удзельнікі канферэнцыі, выкладчыкі і студэнты, расказалі аб вытоках стаханаўскага руху, яго месцы ў сацыялістычным спаборніцтве, аб партыйным кіраўніцтве працоўным пачынам, аб дастойных пераемніках А. Стаханава ў Беларусі і яго жыццёвым шляху. На канферэнцыі, якая прайшла на высокім ідэйна-палітычным узроўні, было адзначана, што 50-годдзе стаханаўскага руху — свята працы ўсяго савецкага народа.

А. ПУХАЎ,
студэнт III курса
гістарычнага факультэта.

### VIII З'ЕЗД ГЕАГРАФІЧНАГА ТАВАРЫСТВА СССР

— старэйшага навуковага таварыства нашай краіны — адбыўся ў Кіеве. У яго рабоце актыўны ўдзел прынялі прафесары, выкладчыкі, супрацоўнікі геаграфічнага факультэта. Выклікалі цікавасць навуковыя даклады і паведамленні прафесараў В. П. Якушка, В. М. Шырокава, дацэнтаў В. С. Аношкі, Р. А. Жмойдзяка, М. К. Чартко, С. І. Сідара, П. А. Каўрыгі, навуковых супрацоўнікаў А. М. Вітчанкі, М. К. Васілеўскай.

На з'ездзе адзначана актыўная і плённая дзейнасць Беларускага філіяла геаграфічнага таварыства СССР, які аб'ядноўвае ў сваіх радах больш чым 450 членаў. Прынята рашэнне правесці на базе БДУ імя У. І. Леніна ў 1987 годзе Усесаюзную нараду па ланшафтазнаўству, што з'яўляецца прызнаннем поспехаў работы географаў універсітэта ў гэтым напрамку геаграфічнай навукі.

В. ЯЦУХНА,
сапраўдны член
Геаграфічнага
таварыства СССР.

### ЗАЛАТЫ МЕДАЛЬ

і званне лаўрэата атрымаў народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш» на V Еўрапейскім фестывалі фальклору ў г. Прыморску (Балгарыя).

М. ТАРАСАВА,
мастацкі кіраўнік
студклуба.

*Геаграфічны факультэт прымае актыўны ўдзел у падрыхтоўцы педагагічных кадраў для школ, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і сярэдніх прафесійна-тэхнічных вучылішчаў. У сувязі з рэформай школы пашыраны цыкл псіхолага-педагагічных дысцыплін, больш увагі надаецца метадыцы выкладання геаграфіі ў школе, правядзенню пазакласных мерапрыемстваў. Перапрацоўваюцца праграмы многіх вучэбных курсаў. У працэсе навучання студэнтаў вялікая ўвага надаецца авалодванню імі метадамі даследавання законаў прыроды і грамадства.*

**Грамадзяне Савецкага Саюза! Актыўна змагайцеся за ўсталяванне сацыялістычнага ўкладу жыцця, камуністычнай маралі!**
*(З Заклікаў ЦК КПСС.)*

*ВУЧОБА — ГАЛОЎНАЯ ПРАЦА СТУДЭНТА*

## На подступах да прафесіі



*ПАДВОДЗІЦЬ вынік усяму працэсу навучання педагагічная практыка, якая праводзіцца на V курсе. У вывучэнні школьных курсаў па фізічнай і эканамічнай геаграфіі патрабуецца вялікая колькасць ведаў. Навучыць дзяцей, пачынаючы з 5 па 9 клас, асновам навукі геаграфіі — задача няпростая. У сучасны перыяд навукова-тэхнічнага прагрэсу аб'ем інфармацыі пастаянна ўзрастае. І таму патрабуецца добрая падрыхтаванасць студэнтаў для таго, каб яны маглі спалучыць тэму ўрока з народна-гаспадарчымі задачамі сённяшняга і заўтрашняга дня нашай краіны.*

*Група студэнтаў праходзіць педагагічную практыку ў сярэдняй школе № 116 г. Мінска, дзе працуюць такія вопытныя педагогі як М. М. Пыліла і С. А. Рослік. У іх ёсць чаму павучыцца нашым студэнтам як у адносінах педагагічнага майстэрства, так і правядзення пазакласных мерапрыемстваў. Студэнты стараюцца. Большая частка іх урокаў ацэньваецца на выдатна. Цікава праводзяць урокі студэнты К. Усава, Т. Янкавец, Г. Трыфанаў, І. Свяртока, якія пры падрыхтоўцы да ўрокаў шырока выкарыстоўваюць дадатковы матэрыял. Шырока прымяняюць праблемны і параўнальны метады навучання М. Цвірко, А. Даушка, Л. Усс, В. Юхневіч. Яны добра аналізуюць карта-схемы, графікі, табліцы. Урокі ўсіх студэнтаў адрозніваюцца сур'ёзнасцю і самастойнасцю падрыхтоўкі.*

*Адметнай рысай педагагічнай практыкі гэтага года ў адрозненне ад мінулага з'яўляецца актыўны ўдзел нашых студэнтаў у пазакласнай рабоце. Кожны з практыкантаў акрамя двух заліковых мерапрыемстваў правёў яшчэ некалькі дадатковых. Задаволены настаўнікі іх работай. Вось як адгукаецца аб практыцы студэнтаў М. М. Пыліла: «Гэта група вельмі старанная і ім усім патрэбна паставіць пяцёркі».*

*Цікавым быў тыдзень геаграфіі, які праходзіў у школе з 21 па 27 кастрычніка. Аб сваіх антарктычных экспедыцыях расказаў дацэнт геафака заслужаны палярнік СССР Ю. М. Емельянаў, які тройчы пабываў у Антарктыдзе. Выкладчыца Т. Л. Казакова арганізавала сустрэчу дзевяцікласнікаў, якія вывучаюць эканамічную геаграфію зарубежных краін, са студэнтамі-замежнікамі з Афганістана, Эфіопіі, Уганды, Коста-Рыкі, што вучацца ва універсітэце. Студэнтамі-практыкантамі праведзены экскурсіі ў Батанічны сад, Заслаўскі гісторыка-археалагічны музей, Мастацкі музей БССР, музей імя Я. Купалы. У восьмых класах прайшла вікторына на тэму: «Ці ведаеш ты сваю рэспубліку?»*

*Педагагічная практыка падыходзіць да канца. Хочацца пажадаць усім студэнтам вялікіх творчых поспехаў на цяжкім, але ганаровым педагагічным шляху.*

*Р. ЖМОЙДЗЯК,*
*дэкан геаграфічнага факультэта, дацэнт.*
*Н. ЖУРАЎСКАЯ,*
*дацэнт.*







*НА ЗДЫМКАХ: Апошнія парады дае заслужаная настаўніца школ БССР М. М. Пыліла студэнтам-практыкантам перад пачаткам заняткаў; Кацярына Усава на ўроку у сёмым «А» класе. «Пасля тлумачэння — будзем замацоўваць»; Т. Янкавец растлумачвае самастойнае заданне ў восьмым «Б» класе па рабоце з табліцай; стараста групы студэнтаў Г. Трыфанаў на ўроку ў сёмым «В» класе.*

*Фота Н. ЖУРАЎСКАЙ.*

## *Насустрач IV справаздачна-выбарнай партыйнай канферэнцыі універсітэта*

**Мы працягваем знаёміць з думкамі дэлегатаў партыйнай канферэнцыі: аб праблемах і дасягненнях універсітэцкіх калектываў.**

# ТОН ЗАДАЮЦЬ КАМУНІСТЫ

*ВАЕННА-ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ*

**Віктар Паўлавіч БАРАБАНАЎ дзевяць гадоў працуе на ваеннай кафедры універсітэта. Ён — член парткома, адказны за абаронна-масавую і спартыўную работу.**

— ***Віктар Паўлавіч, як вядзецца падрыхтоўка студэнтаў да грамадска-карыснай працы і абароны Радзімы?***

— Калектыў кафедры працуе ў адпаведнасці з патрабаваннямі Праграмы партыі, рашэннямі XXVI з'езда КПСС. У гэтай рабоце можна вылучыць два асноўныя напрамкі: вучоба і выхаванне студэнтаў, падрыхтоўка іх да абароны Радзімы на планавых занятках па ваенных дысцыплінах, якія прадугледжаны праграмай навучання. Другі напрамак — работа выкладчыкаў па ваенна-патрыятычнаму выхаванню і правядзенне ваенна-тэхнічных заняткаў у пазакласны час.

— ***Кафедра перш за ўсё вядзе падрыхтоўку кіруючых кадраў. Што садзейнічае выхаванню неабходных камандзіру якасцей?***

— Строга рэгламентаваны распарадак дня, штодзённыя трэніроўкі, выкананне патрабаванняў воінскіх Статутаў, высокае прафесійнае майстэрства выкладчыкаў. Адна з галоўных задач — ідэйна-палітычнае выхаванне студэнтаў. У практыцы работы партбюро кафедры стала сістэмай рэгулярна заслухоўваць справаздачы камуністаў аб іх рабоце ў вучэбных групах.

— ***Як вядзецца на кафедры работа па ваенна-патрыятычнаму выхаванню?***

— Тут асаблівае месца займае пытанне арганізацыі выхаваўчай работы ў пазакласны час. Існуе шмат дзейсных форм работы: сустрэчы, гутаркі, лекцыі, даклады, правядзенне канферэнцый чытачоў, наведванне музеяў, экскурсіі ў воінскія часці. Так, у мінулым навучальным годзе было праведзена 86 сустрэч. Вялікі выхаваўчы эфект даюць сустрэчы з выпускнікамі універсітэта, якія праходзяць службу ў радах Савецкай Арміі. У мінулым годзе прачытана 103 даклады і лекцыі. Сярод іх вялікую цікавасць выклікалі цыклы «Есць такая прафесія — абараняць Радзіму», «XXVI з'езд КПСС пра агрэсіўную сутнасць імперыялізму і неабходнасць далейшага умацавання абараназдольнасці краіны» і іншыя. Афіцэры кафедры правялі 39 дыспутаў на тэму «Ваенна-патрыятычнае выхаванне». Шмат цікавых мерапрыемстваў было прысвечана 40-годдзю Перамогі. Гэта і правядзенне тэматычных вечароў, грамадска-палітычныя чытанні, тэарэтычныя канферэнцыі і інш.

— ***А як пастаўлена на кафедры прапаганда ваенна-тэхнічных ведаў і абаронна-масавая работа?***

— Зараз з камітэтам ДТСААФ, камітэтамі камсамола факультэтаў і іншымі грамадскімі арганізацыямі выкладчыкі кафедры прымаюць удзел у стварэнні ваенна-тэхнічных гурткоў, падрыхтоўцы і правядзенні спаборніцтваў па ваенна-прыкладных відах спорту. Існуе 60 гурткоў і секцый. За мінулы год праведзена 95 спаборніцтваў па ваенна-прыкладных відах спорту. Сярод іх такія як грэбля на ялах, стральба, дэльтапланерызм і г. д.

У сваёй вучобе, падрыхтоўцы сябе да выканання абавязку студэнты бяруць прыклад са старэйшых работнікаў, ветэранаў вайны. Гэта падпалкоўнік Пётр Трафімавіч Каваль, палкоўнікі Іван Ціханавіч Пракапенка, Віталь Васільевіч Хазаў, Сцяпан Кірылавіч Карпенка. Добра прадуманая, правільна спланаваная і мэтанакіраваная вучэбна-выхаваўчая работа служыць для студэнтаў выдатнай школай працы, мужнасці, патрыятызму і гатоўнасці да абароны Радзімы.

**Інтэрв'ю правяла А. БАНКЕВІЧ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**



*ГРУПА вучоных НДІ прыкладных фізічных праблем у саставе супрацоўнікаў Аляксандра Мацвеевіча Мухарскага і Аляксандра Іосіфавіча Тарнапальскага пад кіраўніцтвам дырэктара інстытута Аляксандра Фёдаравіча Чарняўскага атрымала прэмію Савета Міністраў СССР за распрацоўку і ўкараненне ў вучэбны працэс аўтаматызаванай навучальнай сістэмы на базе ЭВМ.*

*НА ЗДЫМКУ: А. Ф. Чарняўскі і А. М. Мухарскі за абмеркаваннем вынікаў новых даследаванняў.*

*Фота А. ВАЛОШЫНА.*

*ТРЫБУНА ПАРТОРГА*

# МЕРКАЙ ВЫСОКІХ ПАТРАБАВАННЯЎ

***Заканчваецца XI пяцігодка. Біялагічны факультэт зрабіў крок наперад у сваім развіцці. Так, па выніках сацыялістычнага спаборніцтва за 1984 год факультэт падзяліў 2—3 месцы з юрыдычным факультэтам. Паспяхова выконваюцца сацыялістычныя абавязацельствы і ў гэтым годзе.***

НА СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНЫМ партыйным сходзе ў красавіку 1985 года камуністы выказалі шэраг крытычных заўваг і прапаноў, накіраваных на далейшае паляпшэнне работы факльтэта. Яны датычылі такіх пытанняў, як удасканаленне вучэбна-выхаваўчага працэсу, павышэнне эфектыўнасці навуковых даследаванняў і ўкаранення атрыманых вынікаў у практыку народнай гаспадаркі, паляпшэнне работы факультэцкага аддзялення таварыства «Веды».

**Больш актыўна стаў працаваць навукова-метадычны семінар выкладчыкаў, распрацаваны дзве праграмы для выкарыстання аўтаматызаванай тэлевізійнай навучальнай сістэмы, вядзецца работа па павышэнню кваліфікацыі выкладчыкаў па выкарыстанню ТСН і вылічальнай тэхнікі ў вучэбным працэсе і НДР студэнтаў. Аб павышэнні якасці вучэбнай работы сведчаць вынікі выступленняў студэнтаў біяфака на Усесаюзнай алімпіядзе «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» у горадзе Кішынёве. Каманда студэнтаў-біёлагаў універсітэта, якая прадстаўляла БССР на гэтай алімпіядзе, заняла прызавое месца сярод каманд біялагічных факультэтаў універсітэтаў краіны.**

Усе крытычныя заўвагі, якія выказваюцца камуністамі на партыйных сходах, партыйных бюро, не застаюцца без увагі.

Па прапановах камуністаў на бліжэйшых партыйных сходах будуць абмяркоўвацца пытанні: «Вынікі працоўнага семестра» і «Аб стане і мерах па паляпшэнню ідэйна-выхаваўчай работы ў інтэрнаце». У падрыхтоўцы да сходаў прымае удзел студэнцкі актыў — камітэт камсамола, прафбюро, студсавет.

**За апошнія гады на факультэце на адкрытых партыйных сходах сталі часцей выступаць студэнты, што дазваляе лепш даведацца пра іх патрэбы, пажаданні. Добра зарэкамендавала сябе і такая форма работы са студэнтамі, як правядзенне сумесных пасяджэнняў партбюро з прадстаўнікамі студэнцкага актыву. На іх абмяркоўваюцца такія пытанні, як павышэнне грамадска-палітычнай актыўнасці студэнтаў, павышэнне іх адказнасці за даручаную справу, забеспячэнне культурнага адпачынку і іншыя.**

Асаблівую ўвагу партыйнае бюро факультэта надае выкананню Пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па пераадоленню п'янства і алкагалізму».

Больш увагі стала надавацца культурнаму адпачынку. Да членаў калектыву, якія ўхіляюцца ад выканання пастановы, прымаюцца меры партыйнага і адміністрацыйнага ўздзеяння. У верасні гэтага года за злоўжыванне спіртнымі напіткамі і прагулы выключаны з радоў членаў КПСС і паніжаны ў пасадзе прафесар Я. Ф. Лунец. Прадстаўлена да выключэння з універсітэта студэнтка III курса М. Лагун, у пакоі якой курылі і распівалі спіртныя напіткі пабочныя асобы. Выкананне пастановы садзейнічае паляпшэнню ідэйна-выхаваўчай работы і маральна-псіхалагічнага клімату ў калектыве.

**В. ЧАРНАГУЗАЎ,**
сакратар партыйнага бюро біялагічнага факультэта.

# СПРАВАЙ ЗАЦВЕРДЗІЦЬ СЯБЕ

**У Статуце КПСС запісана, што адным з асноўных паказчыкаў дзейнасці камуніста з'яўляецца яго творчая работа ў пярвічнай партыйнай арганізацыі. Іншымі словамі, каб паспяхова спраўляцца з выкананнем задач гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, кожны член КПСС павінен памятаць, што іменна ад яго працы залежыць дабрабыт народа, магутнасць нашай краіны. А таму кожны павінен добрасумленна выконваць сваё асноўнае даручэнне — працаваць.**

*ПАРТБЮРО: ДЫЯПАЗОН ДЗЕЯННЯ*

ПАРТЫЙНАЕ БЮРО факультэта журналістыкі ў сваёй рабоце ўлічвае тры асноўныя напрамкі, якія, на наш погляд, павінны стымуляваць работу кожнага камуніста. Гэта — адносіны члена КПСС да справы, да выканання Статута КПСС і партыйнага даручэння.

**Нікога не патрэбна пераконваць, што актыўнасць, баявітасць партарганізацыі залежыць у першую чаргу ад таго, як будзе працаваць партбюро. У сувязі з гэтым на факультэце яшчэ задоўга да справаздачна-выбарнай кампаніі як у партгрупах так і ў партарганізацыі ў цэлым пачынаецца падбор кадраў, гэта значыць, вывучаюцца дзелавыя якасці, схільнасці чалавека да той ці іншай работы, яго ўменне працаваць з людзьмі і г. д. Зразумела, што добрая работа партыйнага бюро пачынаецца з паспяховай работы кожнага яго члена, усёй партыйнай арганізацыі.**

У мінулыя гады ў партбюро выбіралі 9—11 камуністаў (фактычна кожнага чацвёртага члена партарганізацыі). У выніку абавязкі размяркоўваліся нераўнамерна, за некаторыя напрамкі работы адказвалі па два і нават па тры члены бюро. Атрымлівалася, як у той прымаўцы: «У сямі нянек...» У час сёлетняй справаздачнай кампаніі мы адмовіліся ад такой практыкі і ў састаў партбюро выбралі сем камуністаў.

**Другі напрамак у рабоце партбюро — падбор і выхаванне кадраў партгрупоргаў. Партгруп у нас пяць. На жаль, яны працуюць толькі на кафедрах (на курсах няма неабходнай колькасці камуністаў).**

**Партбюро факультэта на пасяджэннях рэгулярна слухае работу партгруп кафедраў па тых ці іншых напрамках іх дзейнасці. У пачатку гэтага года, напрыклад, была заслухана практыка работы партгрупы кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання па кантролю за выкананнем даручэнняў членамі кафедры. Была прынцыпова, падзелавому ацэнена работа кафедры ў гэтым напрамку, выказаны слушныя заўвагі аб актывізацыі дзейнасці камуністаў і беспартыйных. Партгрупа разам з партгрупоргам А. І. Наркевічам крытыку ўспрыняла правільна. На пасяджэнне партгрупы запрасілі ўсіх членаў кафедры. Да іх ведама былі даведзены крытычныя заўвагі, выказаныя членамі партыйнага бюро. І ўжо зараз можна сказаць, што супрацоўнікі кафедры сталі больш сур'ёзна ставіцца да выканання грамадскіх даручэнняў.**

Эфектыўнай формай актывізацыі дзейнасці камуністаў з'яўляюцца творчыя справаздачы на пасяджэннях партбюро. Справаздача камуніста — гэта не толькі «азадачванне», а ў першую чаргу імкненне разабрацца ў прафесійных здольнасцях выкладчыка ці студэнта, яго творчых магчымасцях. Тут, вядома, ідзе размова і аб выкананні камуністамі партыйных і грамадскіх даручэнняў. Іншы раз бывае, што пасля справаздачы камуніст пачынае працаваць менш актыўна, маўляў, да наступнай справаздачы яшчэ далёка. Партбюро факультэта пастаянна кантралюе выкананне камуністамі даручанай справы, а калі наглядаецца нейкі спад у рабоце, творчая справаздача яго выносіцца паўторна на пасяджэнне партыйнага бюро ці на партыйны сход. Тут камуніст трымае слова перад усім калектывам факультэта. Толькі за апошні час з творчымі справаздачамі выступілі камуністы А. В. Балаш, Г. З. Бягун, Е. Л. Бондарава, У. С. Гусараў, В. І. Дубовік, Н. П. Дзенісюк, В. М. Куцэнка, І. Савосценка, В. М. Шэін і іншыя.

**Было б мэтазгодным, на наш погляд, абмяркоўваць выкананне камуністамі даручэнняў на партыйных сходах. У гэтым плане карысна і цікава прайшоў партыйны сход, тэма якога «Асабісты доўг камуніста». Выступаючых было многа. Атрымалася глыбокая і ўсхваляваная размова аб надзённых праблемах, якія стаяць перад калектывам факультэта, перад кожным яго членам, аб якасці і аддачы грамадскай работы. На сходзе выступалі выкладчыкі, студэнты. Крытыкаваліся ўсе тыя, хто заслугоўваў крытыкі. Даволася пачырванець камуністам Л. Крышчань, І. Савосценку, А. Дзядку.**

Партыйнае бюро факультэта журналістыкі імкнецца, каб кожны камуніст даваў максімум аддачы ў вучэбнай, палітыка-выхаваўчай і навукова-даследчай рабоце, каб асабістым прыкладам вёў за сабой астатніх, каб, нарэшце, сам па сабе быў асобай, чаго патрабуе ад яго работа ці вучоба на ідэалагічным факультэце. Большасць нашых камуністаў разумеюць гэта. Іменна дзякуючы іх дзейнасці факультэт мае шматгадовыя добрыя паказчыкі ў вучэбнай і навуковай рабоце, у развіцці студэнцкай мастацкай самадзейнасці, у афармленні нагляднай агітацыі і інш. Пры падвядзенні агульных вынікаў у сацыялістычным спаборніцтве за 1985 год, думаецца, больш высокія месцы мы зоймем у развіцці спорту, мастацкай самадзейнасці сярод выкладчыкаў. Справы тут ідуць добра.

**На жаль, ёсць яшчэ нявырашаныя пытанні. Напрыклад, мы не дабіліся таго, каб грамадскія даручэнні размяркоўваліся раўнамерна. Хацелася б, каб у грамадскай дзейнасці больш актыўна спрабавалі свае сілы студэнты-камуністы.**

**С. ГОВІН,**
**намеснік сакратара партбюро факультэта журналістыкі.**

*Тры пяцігодкі запар выязджаюць студэнцкія будаўнічыя і сельскагаспадарчыя атрады універсітэта ў Мінскую вобласць. Цяжка пералічыць узведзеныя за гэтыя гады аб'екты і, бадай, нельга знайсці ў Клецкім, Нясвіжскім, Капыльскім і Стаўбцоўскім раёнах (у зону ўваходзяць 4 раёны) гаспадаркі, дзе б не пакінулі пасля сябе добрую памяць юнакі і дзяўчаты ў будатрадаўскіх штармоўках. Калі ж падлічыць аб'ём выкананых работ, то ён ужо даўно перайшоў за 6 мільёнаў рублёў капітальных укладанняў. А колькі адрамантавана, пабудавана помнікаў і абеліскаў, прачытана лекцый, паказана канцэртаў мастацкай самадзейнасці! Пра ўсё і не прыгадаеш. Адно можна сказаць: высокае званне студэнтабайца БДУ імя У. І. Леніна заўсёды апраўдвалася.*

# ВЫШЫНЬ ЗАВАЯВАНЫХ НЕ ЗДАВАЦЬ

**ЗАПРАШАЕМ ДА РАЗМОВЫ**

СЕЛЕТНІ ГОД — завяршальны год адзінаццатай пяцігодкі. Прыйшоў час падвесці вынікі нашай работы. Апошнім часам стабілізавалася колькасць атрадаў універсітэта ў саставе Клецкага зводнага СБА. Сёлета іх было 25. Найбольшая колькасць атрадаў была тут філалагічнага факультэта (5 атрадаў) і юрыдычнага (4 атрады). Аднак калі філолагі толькі нядаўна сталі выязджаць у Мінскую вобласць, то атрады юрыдычнага факультэта — даўнія і жаданыя памочнікі працаўнікоў Клеччыны. Варта сказаць, што сапраўднымі ветэранамі занальнага атрада з'яўляюцца СБА імя М. Осіпавай, «Рытм», «Феміда». Першы з іх — дзявочы атрад імя Героя Савецкага Саюза М. Осіпавай — славіцца сваёй працай. Нездарма амаль кожны год становіцца ён лепшым у сістэме Міністэрства пладова-гароднінай прамысловасці БССР. Добрую канкурэнцыю складаюць яму і дзяўчаты з атрада «Пралеска» механіка-матэматычнага факультэта. Шмат спраў і на рахунку атрада «Рытм». Вось ужо 5 гадоў запар выязджае атрад у калгас «Савецкая Беларусь» Клецкага раёна. Кожны год байцы атрада асвойваюць больш за 100—130 тысяч рублёў капіталаўкладанняў.

Іменна ад таго, хто ўзначальвае студэнцкі калектыў, залежыць многае. І сёння прыемна адзначыць, што ў многіх атрадах склалася добрая традыцыя выязджаць «старым» саставам, дзе вопытны камандзір з 2—3 гадовым стажам работы. Сярод такіх кіраўнікоў — Т. Саладкова (атрад «Брыганціна» ФПМ), В. Мяльская (атрад «Славяне» філфака), М. Варабей (атрад «Ісціна» юрыдычнага факультэта). Большасць прымаючых арганізацый — добрыя знаёмыя студэнтаў. Такое становішча спрыяе заключэнню доўгатэрміновых дагавораў, якія, на вялікі жаль, яшчэ не сталі звычайнай з'явай. А заняцца гэтым усур'ёз пара прыйшла. Загадзя, да пачатку працоўнага семестра, ведаць свой аб'ект, разлічыць свае сілы і магчымасці — гэта значыць і летам працаваць лепш. І камсамольскім арганізацыям факультэтаў пара заняцца гэтым неадкладна. Штабу камсамольскіх спраў універсітэта ў сваю чаргу неабходна даць канкрэтныя ўказанні, распрацаваць адпаведную дакументацыю.

Вопыт лепшых атрадаў падказвае і яшчэ адно. Неабходна на кожным факультэце мець сваю школу кіраўнікоў лінейных атрадаў. На філалагічным факультэце ўжо ў кастрычніку — пачатку лістапада пачнецца падбор кіруючых кадраў будаўнічых атрадаў для працоўнага семестра-86. На працягу 3—4 месяцаў яны змогуць дасканала вывучыць методыку фарміравання атрада, работу з дакументацыяй, стан фінансавай дысцыпліны, нарэшце — паспрабуюць сябе ў ролі кіраўніка. Думаецца, што і пачынаць стварэнне атрадаў патрэбна не ў сакавіку-красавіку, а ўжо адразу з першых месяцаў асенняга семестра — у кастрычніку. Так, загадзя можна будзе апрабіраваць будучых байцоў на канкрэтных справах (суботніках, падрыхтоўцы выступлення агітбрыгады, шэфскай рабоце). Такія атрады можна выкарыстоўваць і на універсітэцкіх работах у час канікулаў, у выхадныя дні. Яны маглі б узяць шэфства і нават адкрыць свае майстэрні па рамонту мэблі, рэстаўрацыі, падрыхтоўцы новых стэндаў, вучэбных прыстасаванняў і г. д. Вопыт многіх летніх семестраў паказвае, што ў «скараспелыя» атрады, якія звычайна фарміруюцца ў апошні час, трапляе многа выпадковых людзей. Мяркую, што такім байцам атрад мог бы на сходзе не залічваць удзел у трэцім семестры і рэкамендаваць ім ехаць на сельскагаспадарчыя работы.

Хочацца спыніцца і яшчэ на адным набалелым пытанні. Справа датычыць так званай лекцыйнай работы студэнцкіх атрадаў. Зразумела, ёсць добра падрыхтаваныя лектары. Аднак, калі мы ў красавіку — маі абмяркоўваем і зацвярджаем тэматыку лекцый студэнцкіх атрадаў, то выяўляем вузкаспецыяльныя тэмы, якія падрыхтаваны на аснове вучэбных дапаможнікаў для ВНУ. Мала атрадамі праводзіцца гутарак аб сваіх факультэтах і універсітэце, дасягненнях беларускіх вучоных. Многае з гэтага пад сілу студэнцкім лектарскім групам, але без дапамогі выкладчыкаў ім тут не абысціся. Пара і таварыству «Веды» па-сапраўднаму звярнуць на гэта ўвагу.

Вось некаторыя пытанні такой праблемы, як студэнцкія будаўнічыя атрады. Мяркую, што гэта размова стане штуршком да далейшага паляпшэння работы будатрадаў. Перакананы, што пазіцыі нашага Клецкага занальнага атрада, які пастаянна знаходзіцца ў ліку пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва сярод атрадаў Мінскай вобласці, будуць і надалей моцнымі.

**М. ПРЫГОДЗІЧ,**
**кандыдат філалагічных навук, камандзір Клецкага занальнага атрада ў 1982—1985 гадах.**



# НАВАСЕЛЛЕ

**ТСН — У ВУЧЭБНЫ ПРАЦЭС**

*У БУДЫНКУ факультэта журналістыкі, што па вуліцы Свярдлова, у аўдыторыі № 116 — наваселле. Сюды пераехала з вуліцы Маскоўскай вучэбная лабараторыя тэлебачання і радыёвяшчання, якая працуе пры факультэце на працягу 10 гадоў. Прайшлі першыя заняткі. Студэнты задаволены: пульты відэа- і гукарэжысёраў, тэлекамеры, маніторы, магнітафоны — усё, як у сучаснай сапраўднай студыі.*



СЛОВА — загадчыку тэлестудыі Валерыю Мікалаевічу Блішчу:

— Галоўная мэта тэлецэнтра — навучыць студэнтаў, будучых тэле- і радыёжурналістаў, практычным навыкам работы на сучаснай тэлевізійнай тэхніцы. Статыстыка гаворыць: кожны глядач штодзённа праводзіць каля тэлевізара 2—3 гадзіны. Калі нават узяць мінімальную лічбу — 2 гадзіны, то яе можна дабавіць да вядомых фактаў, што чалавек на працягу жыцця 23 гады спіць, 13 гадоў затрачвае на размовы, 8 гадоў — на ежу і, нарэшце, яшчэ 6 гадоў прыносіць у ахвяру тэлебачанню. Калі гаворыш аб гэтай лічбе, яшчэ больш пачынаеш разумець, якая адказнасць ускладзена на вядучых перадач, рэдактараў, сцэнарыстаў. Таму практычная і тэарэтычная падрыхтоўка студэнтаў у нашым тэлевізійным цэнтры заснавана на тым, каб навучыць іх правільна выкарыстоўваць складаную сучасную тэхніку.

Кожны студэнт можа паспрабаваць сябе ў ролі рэжысёра, аператара, сцэнарыста, вядучага, папрацаваць на відэа- і гукапультах. Пры гэтым магчымасцей для творчасці вельмі шмат. Патрэбны толькі фантазія і ініцыятыўнасць. Ужо ў рабочым стане відэазапісваючая апаратура, якая дазволіць пакінуць на плёнцы ўсё самае цікавае і карыснае, што ствараць студэнты. Гэта можа быць добрае інтэрв'ю, перадача на актуальную тэму, займальная праграма, канцэрт. Гэта практыка будучых работнікаў тэлебачання.

Застаецца толькі дадаць, што яшчэ некалькі месяцаў таму назад лабараторыя была падобна на будаўнічую пляцоўку, але сіламі яе работнікаў В. М. Блішча, І. Мусінскага, А. Крыжаноўскага, А. Паўлюкова і іншых пакой ператварыўся ў студэнцкі тэлецэнтр.

**А. ТАРАСАЎ,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

**НА ЗДЫМКАХ:** будні новага тэлецэнтра.

Фота **А. ВАЛОШЫНА.**

РЭПЛІКА

# НЕ ДА СМЕХУ

МНЕ ЗДАЕЦЦА, я — звычайны чалавек. І, што натуральна, «нішто чалавечае мне не чужое». Ці можа я чаго не разумею, ці ўсё ад таго, што я — першакурснік?

А гутарка аб спартыўнай базе, што на стадыёне БДУ. Вы ніколі не адчувалі там сябе некалькі няёмка (я маю на ўвазе звычайныя патрэбы)? Што, зразумелі, усміхаецеся? Але на мінулых занятках па фізвыхаванню мне было не да смеху.

Не растлумачваю падрабязна, што да чаго, тэма не дазваляе. Але тое, што на базе няма туалетнага пакою, непрыемны факт, з якім мы, першакурснікі, сутыкнуліся і засумавалі.

Небезнадзейнае становішча у тых, хто жыве побач, у інтэрнаце. А калі не так, што рабіць? Згаджуся, мы — дарослыя людзі і дзве гадзіны заняткаў — гэта не тэрмін для здаровага арганізму. Але як выходзяць са становішча людзі, якія працуюць на базе ці займаюцца ў спартыўных секцыях? Пытанні смешныя на слых, але, напэўна, сур'ёзныя на справе. Ці можа тут што не так, дык вы растлумачце першакурсніку. А калі згодны — яшчэ напішу, што на базе няма душа...

**МІКАЛАЙ Н.,**
**студэнт І курса мехмата.**

**З НАШАЙ ПОШТЫ**

# ВЫКАЗВАЕЦЦА ПАДЗЯКА

*У ВЫНІКУ праяўленай ініцыятывы і пільнасці, добрасумленнага выканання грамадскага абавязку студэнтцы V курса факультэта журналістыкі Л. В. СТУКАЛАВАЙ удалося аказаць садзейнічанне органам міліцыі ў раскрыцці злачынства.*

*Людміла была камандзіравана ў г. Шчучын для падрыхтоўкі радыёперадачы. Сумесна з нарадам супрацоўнікаў міліцыі і членаў ДНД несла службу па ахове парадку ў горадзе. У гэты ж дзень быў атрыманы сігнал аб крадзяжу складнога веласіпеда ў жыхара С. І. Трыфанава.*

*На наступны дзень Л. В. Стукалава на вуліцы ўбачыла прапажу, якую апазнала па прыкметах, канфіскавала яе ў падлеткаў і даставіла ў дзяжурную частку РАУС. Веласіпед перададзены радаснаму С. І. Трыфанаву.*

*Г. АШМАНКЕВІЧ,*
*начальнік РАУС г. Шчучына.*

ЦВЯРОЗАСЦЬ — НОРМА ЖЫЦЦЯ

# ПАД ЗНАКАМ БАХУСА

*Спачатку было сумненне: а ці трэба ўвогуле гэты артыкул? Амаль паўгода мінула з дня абнародавання Пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па перааддоленню п'янства і алкагалізму». Здавалася б, часу даволі дастаткова кожнаму асэнсаваць шкоднасць заганнай прывычкі, адмовіцца ад яе назаўсёды. Тым больш, калі гаворка ідзе пра студэнтаў — найбольш свядомы і перадавы атрад савецкай моладзі. Аднак падзеі апошніх дзён паказалі, што назаўсёды ставіць кропку на гэтай тэме яшчэ рана.*

## Аб ісціным і ўяўным

СТУДЭНЦКАЕ жыццё... Час станаўлення і загартоўкі асобы, далучэння да шэдэўраў чалавечай думкі, якой бы галіны гэта не датычылася. І, разам з тым, ва ўяўленні многіх людзей, ды падчас у саміх студэнтаў, моцна ўсталявалася думка аб студэнтах, як аб нейкіх заліхвацкіх малайцах, якім сам д'ябла не брат... Ёсць тут рацыянальнае зерне, тым больш, што яшчэ нядаўна была досыць папулярнай песенька:

*Не те студенты, которые*
*в аудитории,*
*А те студенты, которые*
*прыгают в скорые и — привет!*

Але гэта, як кажуць, адзін бок медаля. Таму што вельмі часта невычэрпная энергія і досыць бязмежны запас выдумкі ўсё ж знаходзяць магчымасць уціснуцца ў рамкі безэмястоўнага марнавання часу, бязмэтнага бадзяння па інтэрнаце...

Усе мы яшчэ ў школе на ўроках фізікі засвоілі адну аксіёму: пустэчы ў прыродзе не бывае. Яна абавязкова запаўняецца. Таксама запаўняецца пустэча адсутнасці зместу ў паводзінах некаторых, з дазволу сказаць, студэнтаў візітам у бліжэйшы гастраном.

...Першымі заўважылі перамену прыбіральшчыцы. Батарэі вінных бутэлек, што некалі выстройваліся да іх прыходу жыхарамі інтэрнатаў каля смецціправодаў, значна парадзелі. Раней школтару цяжка было адным разам даставіць у адпаведны прыёмны пункт, цяпер візіты сюды работніц студгарадка скараціліся да аднаго ў тыдзень. Але не зусім... Пры гэтым трэба ўлічыць узрослую «канспірацыю» з боку тых, хто яшчэ не адмаўляецца «зазірнуць у рыльца». Пустыя бутэлькі старанна загортваюцца ў старыя газеты і такім чынам знікаюць незаўважанымі разам са смеццем.

Таму падлічваць па школтары колькасць выпіваемага жыхарамі студэнцкага інтэрната было б неправамерным.

Узрос кантроль з боку каменданта і студсавета. Усе да аднаго студэнты азнаёмлены з бескампрамісным загадам рэктара... І ўсё ж ад ужывання спіртнога адмовіліся яшчэ не ўсе.

## Адступленне першае

ПІСАЦЬ гэты матэрыял нялёгка. Свядомасць адмаўляецца атаясамліваць два паняцці, палярныя па прыродзе рэчаў: п'янства і студэнцкае жыццё. Бо прызначэнне апошняга наталяць маладую асобу разумным, добрым, вечным, што за час свайго развіцця назапасіла чалавецтва. Прызначэнне «спіртуса віні» — разбураць...

Як нябачны чарвяк, падточвае алкаголь пачуццё ўласнай вартасці, свядомасць, гонар чалавека, усё болей робіць яго бязвольным. На карысць гэтага сведчаць навуковыя даследаванні, заключэнні медыкаў-спецыялістаў. Для пераканаўчасці хочацца прыгадаць вопыт, які быў пастаўлены на пацуках. Жывёлінах, чыя назва ўсё часцей і часцей ужываецца побач з эпітэтам — падвопытныя.

Звяркам у рацыён паступова сталі ўводзіць гарэлку, кожны раз павялічваючы дозу. У хуткім часе яны прыахвоціліся да спіртнога, і вельмі грунтоўна. Калі «захапленне» пацукоў дасягнула свайго апагею, іх не кармілі на працягу сутак. А пасля, галодным і «на пахмелле», паставілі адразу дзве кармушкі. У адной быў любімы раней сыр, у другой — гарэлка. Прычым, праход да апошняй загароджвала медная пласціна, разагрэтая да чырвані. Звяркі кінуліся на пах спіртнога, моцна абпальваючы лапкі... Алкаголь забіў у іх волю, безразважлівы «панаваў» над рэфлексамі. Ці не досыць яскравы прыклад, наколькі небяспечны яд вынайшла чалавецтва для свайго добраахвотнага атручвання?

## Калі б словы з песні выкінуць...

«П'ЁМ МЫ гарэлку, п'ём мы вішнёўку...» Гэта словы са студэнцкай песенькі. На жаль, не адзінай з рэпертуару, што ўслаўляе выпіўку. Адны з іх досыць маладыя, другія, як кажуць,— з барадой. І распяваліся яшчэ можа ў мінулым стагоддзі. Адсюль — памылковае ўяўленне аб студэнтах, як вялікіх аматарах шынкоў і чаркі. У гэтай штучнай бравадзе некаторым і сёння бачыцца «сапраўдны» сэнс студэнцкага жыцця.

Тыя, хто ўжо «паварыўся» ва універсітэцкай кухні, паабцёрся ў самастойным інтэрнацкім жыцці, пазірае на памянёную вышэй браваду як на нешта падобнае да шалупіння, якое абавязкова абляціць з часам.

Горш справа з першакурснікамі. Асабліва з тымі, хто толькі ўчора выпырхнуў з бацькоўскага гнязда ў жыццё і яшчэ як след не ўяўляе, як і куды махаць крыльцамі. Самастойнасці, уласцівасці правільна аналізаваць свае ўчынкі пакуль бракуе. Таму сапраўдных каштоўнасці падмяняюцца таннымі падробкамі. Імкненне жыць цікава і змястоўна падчас замыкаецца на выпіўцы пры зачыненых дзвярах інтэрнацкага пакоя.

...Добра, што абышлося ўсяго толькі адной выбітай шыбай, якую ўсе вінаватыя, апроч А. Фінчанкі, выказалі згоду тут жа кампенсаваць. Як належыць «сапраўднаму» студэнту, пасяленне каменданта інтэрната № 7, дзе адбываліся падзеі, першакурснік успрыняў, як кажуць, у штыкі. З вялікай крыўдай і абурэннем, не досыць падбіраючы выразы, абвінавачваў прадстаўнікоў студсавета і апаратчыкаў атрада ў тым, што яны перашкаджаюць студэнтам адпачываць.

Як гэта часта бывае ў падобных выпадках, усе супярэчлівасці вырашыла паяўленне дзяжурнага нараду міліцыі. Вядома, што А. Фінчанка адразу паспакайнеў. Справа абышлася папярэджаннем, было зафіксавана таксама знаходжанне навaспечанага студэнта ў нецвярозым стане... Думаецца, гэтай фармуліроўкі дастаткова, каб на геаграфічным факультэце строга спыталі з выпівохі-першакурсніка.

## Адступленне другое

КОЖНЫ не без цяжкасці прыгадае, колькі страсцей кіпела, колькі пер'яў і коп'яў было паламана на старонках перыядычных маладзёжных выданняў з нагоды шэрагу самых разнастайных студэнцкіх праблем. Рубам ставіліся пытанні: «Як быць з троечнікамі?», «Хто дапаможа студэнцкай сям'і?», «Ці не занадта мала вольнага часу?». Аўтары палемізіравалі вакол лідэраў фармальных і нефармальных. Спіс можна было б працягваць. Але ці ўспомніць хто з чытачоў заклапочаныя артыкулы аб тым, што ў студэнцкім асяроддзі здараюцца выпіўкі? Згодзен, з'ява, як кажуць, не сацыяльная. Але з другога боку — факт мае месца і ад гэтага нікуды не дзенешся. З гэтым трэба неяк лічыцца, змагацца, нарэшце.

Яшчэ гадоў пяць-сем назад студэнта за тое, што ён трапіў у медвыцвярэзнік, без лішніх размоў выключалі з ВНУ. Пасля ад такой практыкі адмовіліся. Вялікі працэнт выключаных. Гэта зніжае паказчыкі. Падрывае аўтарытэт установы. Увогуле непрыемна. І за начоўку ў спецмедустанове сталі абмяжоўвацца строгай вымовай. Пацярпеўшы, як прынята казаць у такіх выпадках, абыходзіўся «лёгким испугом», рабіў для сябе вывад: «Не трэба было наразацца да чорцікаў». Але піць не кідаў, толькі рабіў гэта больш стрымана.

ВНУ рыхтуюць спецыялістаў для розных галін народнай гаспадаркі, навукі, асветы, праваых органаў, інжынераў для вытворчасці і інжынераў чалавечых душ. А галоўнае, веды, дыплом, а разам з імі і пуцёўку ў жыццё атрымліваюць будучыя кіраўнікі і спецыялісты, каму заўтра будзе даверана самае дарагое — лёс дзяржавы.

Аб якім аўтарытэце кіраўніка, педагога, юрыста можа ісці гаворка, калі са студэнцкага жыцця замест аб'ёмнага багажа ведаў ён вынес заганную прывычку — страсць да спіртнога? Калі гэта самае жыццё прайшло не пад знакам пазнання, спасціжэння ісціны, а пад знакам Бахуса?

Цікавы факт. Становішча «пахмелля» зніжае вытворчасць працы чалавека ў сярэднім на 15,3 працэнта. Рабіць спецыяльныя вывады аб якасці ведаў студэнта, які нават не перыядычна, а выпадкова, час ад часу ўжывае алкаголь, думаецца, залішне.

## Студэнт: гома бібенс ці гома сапіенс?

ШТО ТАКОЕ «гома сапіенс» тлумачыць не трэба, ведаюць усе. З гэтай назвы — чалавек разумны — утварылася яшчэ адна: чалавек, які п'е — «гома бібенс».

Прадбачу нараканні, маўляў, а ці не занадта згушчаны цёмныя фарбы вакол асобы студэнта? Ці не празмерна адыёзна выглядае яго асоба ў матэрыяле? Калі гэта так, аўтару застаецца парадавацца разам з усімі. Але, на жаль, ёсць яшчэ ўсе падставы, каб біць у званы трывогі.

Напярэдадні выхаду ў свет гэтага нумара газеты адбылося пасяджэнне бюро камітэта камсамола універсітэта. На парадку дня: «Персанальная справа... за ўжыванне спіртных напіткаў». На суд камсамольскага актыву выносіцца ўчынак другакурснікаў фізічнага факультэта Д. Касцюка і П. Грышкевіча. Слухалі... Пастанавілі: «...Выключыць з членаў ВЛКСМ, хадатайнічаць перад рэктаратам аб выключэнні з ліку студэнтаў». Двум маладым людзям прыйдзецца развітацца са студэнцкім жыццём, так і не спазнаўшы яго як след. Жорстка? Не, прынцыпова.

Вышэй адзначалася, што студэнты — найбольш свядомая, перадавая частка савецкай моладзі. А кожны свядомы чалавек павінен разумець, што п'янства не толькі загана, не толькі добраахвотнае самавынішчэнне асобы. Перш за ўсё гэта сацыяльнае зло. З ім трэба змагацца ўсімі сродкамі і бескампрамісна. Тым больш у сям'і студэнтаў. «П'яны» і «студэнт» — два паняцці, якія ўзаемавыключаюць адно другое. Таму не павінна быць сумненняў, ваганняў і двазіх думак, калі ў калектыве вырашаецца пытанне аб мэтазгоднасці лічыць выпівоху студэнтам.

Нялёгка знайсці словы, якія б дапамаглі пазбегнуць банальнасцей у размове па сённяшняй тэме. Тым больш, што чалавецтвам сказана і напісана на конт гэтага столькі, што калі б пасля выхаду ў свет чарговага артыкула ці кнігі кідаў піць хаця б адзін чалавек, праблема даўно б вычарпала сябе. Адной газетнай прапаганды тут ужо недастаткова.

Кожны ведае, што піць шкодна, і, між тым, колькасць «гома бібенс» зніжаецца вельмі марудна. У сілу прывычкі, інэртнасці, нізкай свядомасці, унутранай культуры, атручанай алкаголем сілы волі, нарэшце.

У арсенале кожнага калектыву багаты выбар сродкаў барацьбы за цвярозасць сваіх таварышаў, за іх паўнакроўнае, цікавае і змястоўнае студэнцкае жыццё. Шкада толькі, што пра гэта часта ўспамінаюць «пост фактум», інакш кажучы, калі з аднакурснікам прыходзіцца развітвацца. Кожная такая страта няхай будзе перш за ўсе на сумленні групы, курса, факультэта. Калі вакол студэнта ўтварылася так званая «тарычэлева пустэча», значыць, нізкі ўзровень работы як дэканата, так і грамадскіх арганізацый. А таму і вывады неабходна рабіць адпаведныя.

Асаблівай прынцыповасці патрабуе работа студсаветаў і камендантаў. Факты выпівак часцей за ўсё здараюцца іменна ў інтэрнатах. Нягледзячы, што ў гандлёвых кропках, якія знаходзяцца на тэрыторыі і паблізу, зараз не вядзецца продаж спіртных напіткаў. У тым ліку і піва. Выключэнне складае хіба толькі інтэрнат № 3, у буфеце якога дагэтуль не спынены гандаль гэтым напіткам. Пэўна, адказныя работнікі гаргандлю лічаць яго адным з самых неабходных для жыхароў студэнцкага інтэрната.

І яшчэ. Дні нараджэння, іншыя ўрачыстыя мерапрыемствы, калі святочны стол у інтэрнацкім пакоі збірае аднакурснікаў і проста сяброў, — неад'емная частка студэнцкага жыцця. Гэта ўжо традыцыя. Таксама, як і тое, што на такіх «міжсабойчыках» нічога мацней за грузінскі чай не бывае. Але здараюцца і ў правілах выключэнні...

Штабам «Камсамольскага пражэктара» універсітэта, жыллёва-бытавой камісіяй і рэдакцыяй газеты праводзіўся рэйд.

Праходзім па восьмаму паверху інтэрната № 2 і ніяк не можам зразумець, адкуль гэта так тхне тытунёвым дымам. Адчыняем дзверы ў пакой дружбы. Застолле. Ад багацця выпіўкі і закускі трашчаць сталы...

Як нам растлумачыла пасля камендант інтэрната, у аспірантаў і студэнтаў-замежнікаў — урачыстасць, і пакой дружбы яны занялі з яе дазволу. А з чыйго дазволу ўрачыстасць ператварылася ў п'янку? У адказ на гэта камендант толькі густа пачырванела, так і не здолеўшы нічога канкрэтнага сказаць. Што ж, няхай гэта застанецца на яе сумленні, а рэдакцыя газеты пераадрасоўвае пастаўленае пытанне дырэкцыі стадгарадка.

## Адступленне трэцяе і апошняе

ЗАРАЗ ПАЎСЮЛЬ утвараюцца таварыствы цвярозасці. Ёсць такое і ва універсітэце. Яно аб'ядноўвае выкладчыкаў, супрацоўнікаў. У статуце таварыства існуе палажэнне, у адпаведнасці з якім чалавек, заўважаны ва ўжыванні спіртных напіткаў, аўтаматычна выбывае з членаў таварыства.

Было б проста выдатна, калі б уся студэнцкая сям'я Белдзяржуніверсітэта — старэйшай навучальнай установы рэспублікі — безагаворачна ў'яўляла сабой падобнае таварыства. І кожны выпадак ужывання алкаголю разглядаўся як добраахвотны выхад не толькі з ліку новаўтворанага таварыства, а і з ліку студэнтаў наогул.

Стымул задумацца некаторым студэнтам аб выключна цвярозым стылі жыцця даволі абгрунтаваны.

В. ГРАМОВІЧ.
наш кар.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

31 кастрычніка 1985 г.
Зак. 3063. АТ 13789.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ.